Выявление и передача мест обитания вида под охрану. Поддержание на участках обитания колоний традиционной хозяйственной деятельности человека. Сохранение естественно сложившейся мозаичности лугов, лесов и прибрежной полосы водотоков. Полная неприкосновенность мест расположения выводковой колонии.



Школа юного Робинзона

Урок седьмой.
Обустройство лагеря. След зверя



Ведущий — Александр ПИСКУНОВ



Утром Славик проснулся от холода. Зевая и дрожа, он выполз наружу.

Отец возился у костра. Дядя Петя занимался рыболовными снастями. Славик, стуча зубами, подошел к костру.

— Отойди, сгоришь! — резко крикнул отец.

Славик ладонью коснулся спины и мгновенно отдернул руку: материя штормовки обжигала. Он отошел от костра, присел на хворост и вновь уснул.

Проснувшись, Славик увидел, что отец стучит топором у костра, а дядя Петя наладил снасти и собрался идти на рыбалку. Отец задержал его:

— Чай готов. Попьем и разбредемся.

Славик без аппетита сжевал хлеб с салом и выпил кружку сладковатой, с брусничной кислинкой воды. Он наконец по-настоящему проснулся и начал подбрасывать хворост в огонь.

Отец сказал:

— Не жги зря дрова.

Славик немного расстроился: за что ни возьмешься — все запрещают.

— Дядю Петю отпускаем за провизией, — сказал отец. — А нам с тобой нужно огородить костер, а лучше — сделать очаг. Затем выкопать ров вокруг шалаша, чтобы в ливень нас не затопило. Уплотнить крышу и стены, дверь сделать. Оборудовать подход к роднику. Да и дрова нужны...

Славик приуныл: отец перечислил слишком много работ.

— Я на рыбалку хочу, — сказал он.

Отец помолчал немного.

— Мы приехали сюда добровольно. Каждый сам решает, что ему делать. Лично я буду заниматься обустройством лагеря, потому что много рыбы не наловлю...

Славик понял, что ему придется таскать камни и хворост.

— Я тоже хочу копать и строить, — подал голос дядя Петя. — Дров, во всяком случае, смогу наломать. А рыбалка — дело рискованное, может и не повезти.

— Не бузи, — строго сказал ему отец. — Тебя в приказном порядке отправляем за харчами.

Дядя Петя ушел. Славик с отцом отправились за камнями для очага.

С первым же камнем мальчику пришлось помучиться — его засосало в вязкую землю. Пока Славик дотащил его до костра, отец уже успел принести много разных камней.

— Поищи лучше маленькие, — сказал он.

Мелких было много, но носить их можно было только по одному в каждой руке.

Потом Славик пошел собирать хворост. Принес охапку, другую, но вчерашняя куча почти не увеличилась. Мальчик разозлился и притащил еловую макушку с голыми сучьями.

Отец в это время выкладывал камни вокруг кострища. Два крупных камня положил на расстоянии друг от друга — как раз для котелка. Рогульки, поставленные дядей Петей, обложил у основания камнями, а перекладину пока убрал.

— Я еще несколько пар поставлю чуть подальше, — объяснил он Славику. — И одежду понадобится сушить, и рыбу вялить.

Ров вокруг шалаша копали вдвоем. Отец затесал два колышка в виде лезвия, ими и пришлось ковырять землю.

Они окопали шалаш, соорудили очаг, натаскали хвороста и даже сделали стулья, а времени до обеда оставалось много. Решили наведаться к роднику. Там Славик напился воды и хотел идти на стоянку. Его внимание привлекла странная ямка в грязи. След...

Отец внимательно осмотрел находку.

— Может, это волк? — предположил Славик.

Отец зачем-то положил поперек следа тонкую палочку.

— Нет, — сказал он неуверенно, — скорее собака.

— А если волк? — Славик представил на миг клыкастую пасть.

— Ну и ничего страшного, — ответил отец. — Подумаешь, пришел зверь попить чистой воды... Смотри, вон дядя Петя машет удочкой. Сходи к нему за уловом, а я воды наберу и пойду костер разжигать.

Упрашивать Славика не пришлось. Он хотел идти по новому мостику, но полоса раскисшей земли оказалась серьезным препятствием.

— Обходи по верху. Еще один мостик делать не будем. Как индейцы, будем каждый раз новым путем подходить к лагерю, чтобы не привести врагов.

Славику предложение понравилось.

Тайны “Адской кухни”




Пожалуй, самое недооцененное место в Кении — это каньон Марафа, или, как называют его местные жители, "Адская кухня". Невероятное чудо природы расположено рядом с городком Малинди на берегу Индийского океана.

Дорога к каньону интересна сама по себе, ведь она проходит по сельской местности с полосами красной почвы, белым меловым песком и такого же цвета камнем. В сельских общинах женщины переносят мешки и ведра на голове, а дети носят своих младших братиков и сестричек в платках за спиной.

Согласно легенде, Марафа возникла из-за Божьего гнева на одну богатую семью. Они были настолько избалованы и экстравагантны, что купались в молоке своих коров, в то время как их соседи голодали. Бог был разгневан их образом жизни и наказал семью, разверзнув землю под их домом. С тех пор в этих местах много красного и белого песка, как напоминание о том, что за молоко нужно заплатить кровью.


По другому преданию, на этом месте когда-то был город. Однажды местным жителям явилось видение, в котором их предупредили о приближающемся природном катаклизме. Все население покинуло город, и только одна древняя старуха по имени Марафа не поверила видению и осталась. Неожиданно земля расступилась, и город рухнул в пропасть... Позже место назвали в честь исчезнувшей в пропасти старухи.

У геологов есть свое объяснение этому необычному явлению, и оно очень простое: скальные образования состоят из пластов земли смешанных пород. Некоторые из них жесткие, некоторые мягкие. Рассыпчатые песчаные скалы были разрушены быстрее, чем более крепкие высокие слои. Различные скальные пласты имеют в своем составе красное железо, желтую охру и белый мел. Этим и объясняется разнообразие окрасок в ущелье.




На протяжении многих лет рассыпчатые песчаные скалы размываются под действием дождя и ветра, оставляя неровные изгибы и выступы. Процесс формирования каньона продолжается до сих пор. За последние 10 лет из-за сильного истончения нижнего слоя уже рухнули три скальных образования.

В “Адской кухне” расположено множество неровных ущелий и высоких скальных столбов, некоторые из них достигают 30 метров в высоту. На экскурсии по каньону местные гиды рассказывают не только о скалах, но и об истории здешних мест, и о народном фольклоре. Лучше посещать Марафу на закате, когда в нежных лучах солнца краски становятся еще ярче.



Один из дней своего месячного путешествия по Кении я уделила посещению Марафы. Местный гид подсказал, что землю разных цветов можно смешивать и получать другие интересные оттенки. А соответствие названия “Адская кухня” действительности я испытала на себе — температура воздуха внутри каньона нередко зашкаливает за +50 градусов!

Таня ГЕНДЕЛЬ
Фото автора





Музыка і рамеснік Уладзімір Дрындрожык вырабляе вельмі цікавую і нават магічную рэч — посах дажджу. Адмыслова для нашых чытачоў Уладзімір даў майстар-клас і распавёў гісторыю гэтага незвычайнага посаху. Яго іншая назва — флейта дажджу. І гэта не выпадкова, бо посах можна выкарыстоўваць і як музычны інструмент. Але пра ўсё па парадку.

Засушаны дождж

Посах дажджу з'явіўся даўным-даўно, калі яшчэ панавалі паганскія абрады. Лічылася, што ён дазваляе чалавеку кіраваць надвор'ем. Калі доўга няма ападкаў ці калі стаміліся ад залевы — дапаможа посах. Таму на кірмашах народных рамёстваў Уладзімір заўсёды папярэджвае пакупнікоў пра магічныя ўласцівасці гэтага прадмета.

Выраблялі посахі на тых землях, дзе былі расліны з пустым ствалом. Звычайна гэта быў бамбук. А на тэрыторыі Беларусі — баршчэўнік Сасноўскага. Але ж вядома, што гэта атрутная расліна. "Толькі не ў высушаным выглядзе, — тлумачыць Уладзімір. — Я ўвосень назапашваю высахлыя сцёблы, і яны абсалютна бяспечныя для выкарыстання".

Матэрыялы і інструменты

Каб змайстраваць посах дажджу, нам спатрэбяцца (1): высушанае сцябло баршчэўніку, калыпкі, корак, лак для дрэва, піла, кусачкі, шыла, наждачная папера, клей. Асобна трэба сказаць пра крупы. Ад памеру крупінак, іх формы залежыць гук флейты дажджу. Напрыклад, самы далікатны гук атрымліваецца пры выкарыстанні манкі ў якасці напаўняльніка сцябла, а гарох дае эфект каменяпаду. Можна засыпаць асарці з розных круп і атрымаць цікавы гук. Шум ветру, шапаценне лісця, журчанне ручая, марскі прыбой, град, дождж — такія гукавыя асацыяцыі атрымліваюцца ў залежнасці ад напаўняльніка.

"Таксама асобна скажу пра аздабленне посаху — тут ужо ўсё залежыць ад фантазіі. Калі дазваляе якасць сцябла, можна зрабіць роспіс. Вяроўкі, стужкі, пацеркі, гузікі — усё падыдзе для ўпрыгожвання", — тлумачыць Уладзімір.

Тэхналогія

Бяром сцябло баршчэўніка, пракολваем шылам дзіркі так (2), каб парадак іх размяшчэння нагадваў спіраль (3). Яна павінна быць не надта шырокай, але і не завузкай. Менавіта ад колькасці калыпкоў залежыць працягласць гуку.

У дзірачкі прасоўваем калыпкі так, каб яны ўперліся ў другі бок сцябла (4).


2


3


4



1







Гэта цікава

Баршчэўнік — пераважна двухгадовая, радзей шматгадовая трава. Сцёблы ў розных відаў уздымаюцца на розную вышыню — ад 20–50 см да 250 см; як правіла, яны полыя.

Сухія (перазімаваўшыя) сцёблы баршчэўніку спрадвеку выкарыстоўваліся на Русі для вырабу народнага музычнага інструмента — калюкі, разнавіднасці абертонавай флейты. Дарэчы, Уладзімір Дрындрожык можа зладзіць і такі інструмент.

Цяпер сцёблы сухога баршчэўніку выкарыстоўваюць таксама для вырабу рэйнсціка — музычнага інструмента, роду перкусіі.

Затым з боку сцябла абразаем кусачкамі лішнюю частку калыпкоў (5), але не зусім пад корань. Потым ручкай кусачак ці яшчэ чым зручным прасоўваем калыпкі так, каб яны не выпіралі са сцябла (6).

Цяпер неабходна закаркаваць посах з аднаго канца. Добра, калі знайшоўся падыходзячы па дыяметры корак ці ёсць магчымасць падагнаць яго да патрэбнага памеру. З аднаго канца посах можна шчыльна закаркаваць. Напрыклад, Уладзімір выкарыстоўваў для гэтай мэты гофракардон (7). Але, папярэдзіў майстар, абавязкова перад тым, як яго прыклеіць, трэба зрабіць мяккую імітацыю корка, напрыклад, з тканіны ці паралону, інакш будзе дрэнны гук.

Для другога канца сцябла Уладзімір раіць падбіраць такі корак, каб можна было час ад часу мяняць напаўняльнік, а значыць, і гук.

У посах трэба засыпаць крупы, звычайна дастаткова 2/3 шклянкі, але калі сцябло даволі тоўстае, то можа спатрэбіцца і цэлая шклянка (8). Пасля гэтага неабходна закаркаваць другі канец (9).

Засталося ўпрыгожыць посах. Найперш можна крыху пачысціць сцябло наждачнай паперай, затым пакрыць лакам. Уладзімір раіць набываць хуткасохнучы лак для дрэва. Калі ён высахне, пара прыступаць да мастацкага аздаблення посаху, і тут ужо можна даць волю фантазіі.

Уладзімір расказаў, што посах даждж дзеці выкарыстоўваюць замест пластмасавых бразготак, а для дарослых гэта сродак медытацыі. Сапраўды, вельмі добра пасля насычанага працоўнага дня прыйсці дадому і паслухаць, напрыклад, шум марскога прыбою. І такую цудоўную рэч, дзякуючы майстар-класу ад Уладзіміра Дрындрожыка, можа вырабіць кожны з вас, шаноўныя чытачы.

Аксана ЯНОЎСКАЯ
Фота Надзеі БУЖАН





БЯРОЗКА
Светам кіруе той, хто чытае

Беларуская прырода ў люстэрку ракі Сож

Рака Сож — сапраўдны музей прыроды Гомельшчыны. Шчымліва-непаўторныя гукі ўсплёскаў вады, высокі пясчаны бераг, пышныя постаці дрэў і зялёнае полымя лістоты ствараюць каларытны малюнак велічнай прасторы. Павольна нясе свае хвалі Сож. У люстэрку вады адлюстроўваюцца будынкі горада, водбліскі ад залатых купалоў царквы і прыгажосць маёвага парку.

А як прывольны прасторы лугоў вакол!

Сож — любімая рака маёй сям'і. Кожнае лета мы адпачываем на яе маляўнічых берагах. Гэта самыя непаўторныя моманты майго жыцця, калі ёсць магчымасць адчуць прахалоду чыстай вады, сплесці вянок з сіненькіх і жоўтых кветачак, а таксама пачуць буслiны клёкат.

Прырода Сожа натхняе на лірызм і творчасць. Цішыня і спакой — вось непаўторная адметнасць гэтай сінявокай ракі. Ціхамірнасць заўсёды паступова ахутвае маю душу, адганяе кепскі настрой, калі я знаходжуся на беразе Сожа. Люблю назіраць, як плывуць срэбныя павуцінкі па вадзе, а высока ў небе ляцяць птушкі. Тут добра і лёгка дыхаецца, тут спакой і цеплыня.

Захоўвае рака ўсе шэпты, рухі і гукі беларускай прыроды. Шуміць чарот, стракочуць конікі на лузе, гойдаюцца ад лёгкага ветрыку блакітна-ліловыя званочкі, плёскаюцца рыбкі ў водных хвалях. Гэта вечна жывы, чароўны шум маёй любімай мясціны. Адчуваеш, што прырода з табой размаўляе.

І так хораша, светла на душы!

Дар'я ШУДРОВА,
гімназія № 51, г. Гомель

Дзьмухавец



У гэтым годзе я расцвіў вельмі позна, амаль у жніўні. Недарэчна неяк здарылася. Сумаваў моцна. Адчуванне такое, нібыта я адзін у полі. Агледзеўся — так і ёсць: адзіны дзьмухавец! Я так бы і жыў у сваім суме, калі б не яна. Дзяўчынка. Яна прыходзіла кожны дзень ды рассцілала каля мяне чырвонае пакрывала. Тыдні выдаліся спякотныя, але яна не ішла ў цянёк, які давала дрэва каля ракі, а заставалася ля мяне. Не ведаю нават, што яна адшукала такога асаблівага ў маленькім дзьмухаўцы. А можа, яе вабілі пчолы і чмялі, якія падоўгу сядзелі на маёй жоўтай пухнатай галаве? Ці смак майго лісця, якое яна, зморшчыўшыся, жавала? І абавязкова дзякавала, што я вырас такі смачны ды прыгожы.

А потым нешта здарылася — за адну ноч я састарэў і пасівеў. Стаў амаль што нябачным, зліўся з небам. У той дзень яна не прыйшла. І ў наступны — таксама. Пахаладала. Вецер дзьмуў бязлітасна. Мяне гнула да зямлі, і я не мог падняцца. Ды і не надта хацелася. Хацеў хіба толькі знікнуць сярод пажоўклай травы...

А раніцай усё сціхла. Сонейка ўзнімалася над лесам. На луг прывялі коз. Яе я ўбачыў яшчэ на дарозе. Яна бегла па калючай траве да мяне. Плюхнулася побач і часта дыхала. Потым прытулілася шчакой да маіх сівых валасоў і асцярожна, каб выпадкова не зламаць, пагладзіла іх. Які я быў шчаслівы! І больш не адзінокі!

Соф'я ФЕДЧАНКА,
гімназія № 4, г. Мінск

Лета

Вясна адплакала дажджамі,
Сышоў апошні шэры снег —
З цяплом і птушак галасамі
Зноў лета пачынае бег!

Яму мы рады, як ніколі, —
Навокал кветкі расцвілі.
Заняткі скончыліся ў школе —
Да нас канікулы прыйшлі!

То луг нас кветкамі чаруе,
То ў спёку пазаве рака...
Лес шчодры ягад прапануе
І цень зялёнага дубка...

Яна КРУПСКАЯ,
СШ № 1, г. Заслаўе





Дзве “прыгажуні”

Жыла ў адной сажалцы Жаба. А на беразе, пад яловым карчом, Рапуха жыла. І кожная з іх сябе вялікай прыгажуняй лічыла. Вось толькі ніяк дамовіцца не маглі, хто з іх прыгажэйшая.

Неяк вылезла Жаба на купіну, сядзіць, у ваду пазірае, сабой любуецца і кажа Рапусе:

— Бачыш, сястрыца, якая я прыгожая?

— А я?! — пакрыўджана пытаецца Рапуха.

— Ты таксама нічога! — заспакойвае яе Жаба. — Вось толькі ногі ў цябе крыху караткаватыя і скура занадта шурпатая! А так бы зусім да мяне падобнай была!

— Нічога ты ў прыгажосці не разумееш! — не згаджаецца Рапуха. — Гэта ў цябе ногі занадта доўгія і скура занадта гладкая! Калі б не гэта, ты б таксама была такой прыгожай, як і я!

А на галінцы Сарока сядзела. Слухала яна, слухала, а потым як засмяецца.

— Гэй вы, прыгажуні! — засакатала яна. — Вунь Бусел сюды ляціць, ён вялікі спец па прыгажосці!

Пачула гэта Жаба, адразу ж у ваду скокнула. А Рапуха пад корч забілася. Бо прыгожай быць добра, а жывой застацца — яшчэ лепш.

Эма ТРАЦЭЎСКАЯ,
гімназія г. Светлагорска

Глыток шчасця

Шчаслівы той, хто ў лесе
Бывае з году ў год.
Я ведаю: ратуе
Ён ад усіх нягод!

Лес — як глыточак чысты
Спакою, глыбіні,
І цішыні імшыстай,
І проста дабрыні!

У лесе адчуваеш,
Што сілы жывяць зноў,
І думаеш: як добра,
Што ты сюды прыйшоў!

Анастасія АНАНСАН,
Заслаўская гімназія,
паэтычны клуб “Ізяслаўцы”

Хлебны акіян

Ветрык вее мае валасы,
Расхістае іх, як каласы
Ранкам летнім...

І вакол, ну, куды ні глянь,
Коціць хвалі свае акіян,
Толькі хлебны...

Эма ТРАЦЭЎСКАЯ,
гімназія г. Светлагорска

Смачнае лета

1.
Лета — гэта марозіва,
якое заўжды растае
і павольна,
і хутка...
У ім — мармеладкі-кветкі,
і буякі-азёры,
і шакаладная зямля,
і зорныя арэхі...
І яны найсмачнейшыя ўлетку,
калі ёсць вакацыі,
што растаюць
і павольна,
і хутка...
Таму ўсё вакол —
і сумна,
і прыгожа.
І я ўсцешаная,
што паспела нарадзіцца,
пакуль не растала марозіва.

2.
Цудоўныя цымбалы,
як кветка,
што жыве музыкай.
Дзынь-дзынь,
дзынь-дзынь —
лётае чмялянё,
бярэ музычны нектар.
Соль-соль,
соль-соль —
нябёсы захінуліся
ў струнную душу.
Дзень-дзень,
дзень-дзень —
дакранаюся
да нотак-зорак.
А ночы няма...

Альжбэта МАЛІШЭЎСКАЯ–СПРЫНЧАН,
гімназія № 23, г. Мінск

Села сонейка ў пясочак

За пагоркам, дзе лясочак,
Села сонейка ў пясочак.
Села і адпачывае
Ды пра заўтра разважае:
“Заўтра ўстану роўна ў пяць.
Трэба толькі не праспаць.
Буду пеўніка прасіць
Мяне зранку разбудзіць!”

Іван ЯКІМОВІЧ,
Заслаўская гімназія,
паэтычны клуб “Ізяслаўцы”

Малюнкі Лізаветы ЛЯНКЕВІЧ
Фота Кацярыны УЛАСАВЕЦ

Ліпень — макаўка лета. Ён увабраў у сябе ўсю палітру колераў і пахаў. Кветкавы, мядовы, ягадны, гэты месяц шчодра дзеліцца з намі сваімі багатымі дарамі і не перастае радаваць яркімі фарбамі. А яшчэ ліпень — гэта Купалле, таямнічы час, калі дзяўчаты плятуць вянкі з лугавых красак, хлопцы распальваюць вогнішча, а потым усе разам адпраўляюцца на пошукі чарадзейнай папараць-кветкі. Калі вы яшчэ не знайшлі сваю кветку — не адчайвайцеся. Зусім не абавязкова ісці за ёй у купальскі лес. Азірніцеся. Магчыма, ваша кветка яшчэ толькі распускаецца ў лузе, у садзе ці проста ў кветніку і чакае толькі вас, каб адкрыць свае таямніцы і спраўдзіць вашы мары. Трэба толькі прыгледзецца, каб не прапусціць сваё шчасце. Лета. Ліпень. Усё яшчэ наперадзе...


Фота Наталії ТРАЦЭЎСКАЙ


Кацярына УЛАСАВЕЦ, Капыль


Вольга КАЧАНОЎСКАЯ, Мінск


Аляксандра ЛЕНКАВЕЦ, Дзяржынск

Паважаныя чытачы!
Дасылайце свае фотаздымкі, вершы і замалёўкі на паштовы адрас: 220034, г. Мінск, вул. Захарава, 19 ці на e-mail: pryroda@zviazda.by.
Дзяліцеся прыгажосцю роднай прыроды!


Фота Уладзіміра ГВАЗДЗЕНКА

"Боская працаўніца",
або Стаўленне да пчалы і бортніцтва ў традыцыйнай культуры беларусаў

"Стой, рой малады!
Не іграй, да сырой зямлі прыпадай.
Вось вам, пчолкі, святліца —
новая, цясовая, адмысловая.
Жыць вам тут і быць вам тут
сто лет і сто зім.
І ты, матка ліпа Валляна,
ліпа — красна дзявіца,
і ты, труцень Іван, параней уставайце,
сваіх дзетак пабуджайце і пасылайце іх
у цёмныя лясы, у шчодрыя бары.
Майце шум баравы, майце рой пудовы,
мядзвежую лапу, воўчы рост.
Саграбайцеся, змятайцеся.
Да чужых пчол не лятайце
і чужых да сябе не пускайце.
Як маці зямлі, свайго месца пільнуйцеся".

Абярэг на пчол

"Ежа багоў"

"Калі хочаш захаваць маладосць — ужывай мёд" — раілі старыя, а значыць, мудрыя людзі. Каштоўныя ўласцівасці гэтага прадукта вядомыя даўно. Мёд — крыніца сіл і здароўя, бо ён утрымлівае ў сваім складзе больш за 100 рэчываў, жыццёва важных для арганізма чалавека. Нашы продкі збіралі мёд з вулляў дзікіх пчол, а зразумеўшы яго карыснасць, яны прыйшлі да думкі прыручыць гэтых насякомых. Паступова чалавек авалодаў майстэрствам бортніцтва, а асноўны прадукт жыццядзейнасці пчол заняў пачэснае месца ў рацыёне славян.

Тое, што мёд выкарыстоўваўся ў абрадах і рытуалах каляндарнага і сямейна-родавага цыклаў, надзяліла яго пэўнай ступенню сакральнасці, магічнай сілай. У легендах і паданнях мёд сімвалізаваў крыніцу мудрасці і даўгалецця, яго называлі ежай багоў і верылі, што менавіта ён дапамагаў жыхарам Нябёсаў быць бессмяротнымі і захоўваць вечную маладосць. У біблейскіх паданнях у краіне, дзе жыў Маісей, цяклі малако і мёд. Невыпадкова Боскае слова параўноўвалі з мёдам і казалі, што яно "саладзей за мёд". Акрамя таго, гэты прадукт здавён быў сімвалам "салодкасці", дабрабыту, высокага ўзроўню жыцця. І калі чалавек мог дазволіць сабе выкарыстоўваць у сваёй ежы мёд, значыць, жыццё яго ішло добра, было поўным радасцей і задавальнення.

Пчала працуе — чалавек сямейнае жыццё будуе

Сама ж “боская працаўніца” — пчала — у культуры многіх народаў свету стала надзвычай шматпланавым сімвалам. Яна з’яўлялася ўвасабленнем працавітасці і стараннасці, арганізатарскіх і творчых здольнасцяў, мудрасці і храбрасці, самаадданасці, эканомнасці і беражлівасці. Часам пчала выступала сімвалам адукаванасці, таму што раней чытаць і пісаць даводзілася пры васковых свечках.

У старажытных славян пчала стала сімвалам кахання, таму што аб’ядноўвала ў сабе і радасць, асалоду (мёд), і гаркоту (джала) — тое, без чаго не абыходзіцца сямейнае жыццё. Мёд даволі часта выкарыстоўвалі на вяселлі. Яшчэ ў Сярэднявеччы, калі расчэсвалі валасы жаніху і нявесце, іх абавязкова мазалі мёдам. Маладым крычалі “горка”, але пры гэтым прапаноўвалі падсаладзіць іх вусны мёдам. Яшчэ і сёння ў паўднёвых раёнах Беларусі маладую пару пасля вянца сустракаюць на парозе хаты з хлебам-соллю і абавязкова з мёдам, каб “жыццё было салодкім”.

Цікава і тое, што час пасля вяселля называюць мядовым месяцам. Можа, таму, што гэта самая “салодкая” пара ў сямейным жыцці, ці таму, што мёд збіраюць вялікія працаўніцы — пчолы. Магчыма, філасофія нашых продкаў была ў тым, каб гэты першы месяц сумеснага жыцця быў галоўным у вялікім сямейным жыцці: маладыя павінны былі шмат папрацаваць, каб пабудаваць адносіны паміж сабой, роднымі і сваякамі, зусім як тыя пчолы, каб “сямейнага мёду” хапіла на доўгія гады.

Практычна на ўсіх святах ужывалі “медавуху” — мёд, разведзены на вадзе. “Бабіну кашу”, якую падавалі ў канцы радзінаў і якую павінны былі выкупіць хросныя бацькі дзіцяці, бабка-павітуха моцна “запраўляла” мёдам.

Выкарыстоўвалі гэты прадукт і за жалобным сталом. У ваду, падсалоджаную мёдам, клалі невялічкія кавалачкі булкі. Гэта рытуальная ежа, з якой распачыналася жалобная вячэра, насіла назву “сыта” або “канун”. Прычым першым яе звычайна браў самы сталы чалавек, і ён павінен быў першую лыжку выліць на стол. Такія дзеянні прадказвалі (праграмавалі) “салодкае” жыццё памерламу на “тым” свеце.



Фота Аляксандра РАКОВІЧА

Дрэннага ўджаліць, добрага — не кране

Пчолы заўсёды былі спадарожнікамі нябесных багоў. Хрысціяне падтрымалі гэтую традыцыю: пчаліны мёд стаў сімвалам Хрыстовай дабрадзейнасці, а джала — яго пакутаў. Лічылася, што пчала джаліць толькі грэшнікаў. У народзе казалі: “Пчолы не любяць дурных людзей, а добрага чалавека пчала не кране”. Сяляне былі перакананыя ў тым, што чалавеку злоснаму, грахоўнаму лепш пчол не заводзіць, усё роўна нічога добрага з гэтага не атрымаецца.

Адкуль пайшлі пчолы? Старажытныя людзі былі перакананыя, што гэтыя насякомыя з’яўляюцца на свет “самі па сабе, з воску і мёду”, таму пчала была таксама сімвалам цнатлівасці. Так яна стала ўвасабляць адвечную дзявоцкасць Дзевы Марыі.

Часам выяву пчалы можна сустрэць на надмагільных камянях — як сімвал бессмяротнасці. Магчыма, гэта тлумачыцца тым, што абуджэнне насякомага пасля зімовага сну атаясамлівалася з уваскрэшаннем пасля смерці.

Згодна са старажытнымі паданнямі, святымі пчолы сталі таму, што джалілі рукі людзей, якія прыносілі пакуты Хрысту, і дапамагалі Сыну Божаму ў перадсмяротны час. Як сведчыць паданне, пчолы прылятаталі роем і

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА

пілі крывавы пот у час яго пакутаў на крыжы. Таксама лічыцца, што менавіта гэтыя насякомыя першымі разнеслі вестку пра яго ўваскрэшанне. Пчалу заўсёды лічылі Боскай угодніцай, таму што яна "робіць воск на свечкі" — "Богу ахвяру прыносіць".

У "Мінскіх епархіяльных ведамасцях" за 1874 год было змешчана наступнае паданне пра паходжанне пчол: "Ішоў Спас па сінім моры, бачыць сярод мора камень, на гэтым камені сядзіць прыгожая дзяўчына і плача. Як упадзе слёзка — вылеціць пчолка. Спас, глянуўшы на гэтую прыгожую дзяўчыну, быў крануты яе слязьмі і сам не мог утрымацца ад слёз. А таму і гаворыць гэтай прыгожай дзяўчыне: "Няхай жа і мая слёзка будзе між тваімі". Упала слёзка, і выляцела вялікая пчолка-матка".

"Без Бога не да парога, без Зосімы-Савація — не да вулля", "Зосіма пчол гадуе, мёд у соты налівае" — казалі даўней. З прыходам хрысціянства на ўсходнеславянскія землі святыя Зосіма і Савацій Салавецкія сталі ахоўнікамі пчол і тых, хто займаецца пчалярствам, таму што гэтыя прапаведнікі самі актыўна распаўсюджвалі пчалярства на паўночных землях. Існавала паданне, што ў часы, калі жылі гэтыя святыя, на славянскіх землях яшчэ не было пчол, і што яны першымі прынеслі іх з зямлі Егіпецкай, набраўшы пчаліных матак у трысняговую трубку. Гэта паданне пра праведныя справы Зосімы і Савація перадавалася з пакалення ў пакаленне. І сёння на вуллях можна ўбачыць невялікія іконы з выявамі гэтых святых, якія пчаляры прымацоўваюць у якасці абярэгаў.

Да святых-ахоўнікаў звярталіся з асобай малітвай або замовамі, напрыклад: "И Зосима, и Савватий, помилуйте своими молитвами меня, раба Божьего (имя), во дворе или в лесу, на пчельнике, и пчел молодых, и старых, на выстановке, во всяком году, во всяком месяце, в четверти и полчетверти".

Паўсюдна ў дні ўшанавання святых з іменем Зосіма служылі набажэнствы "пчалінаму Богу", прыносілі ў царкву мядовыя соты, апырсквалі вуллі святой вадой, "частавалі" пчол асвечанай на Благавешчанне просвіркай і г.д. На працягу года такімі днямі былі: 17.01 — дзень ушанавання прападобнапакутніка Зосімы; 30.04 — дзень ушанавання прападобнага Зосімы, ігумена Салавецкага; 21.08 — перанясенне мошчаў прападобных Зосімы і Савація Салавецкіх; 2.10 — дзень ушанавання пакутніка Савація і пакутніка Савація-пустэльніка; 10.10 — дзень ушанавання Савація, ігумена Салавецкага.

"Пчаліным" святам лічылася 30 красавіка, а ўвосень святкавалася так званая "пчаліная дзевяціна", якая доўжылася з 2 па 10 кастрычніка.

Пчаліны "гаспадар"

Сярод усходніх славян пчалярства лічылася адным з самых шануемых і ў той жа час таямнічых промыслаў. Па народных меркаваннях, пчолы — "гэта нябесныя мухі, якія прылятаюць і ўлятаюць ніадкуль". Таму тых, хто меў шмат вулляў, а значыць, змог прыручыць "непаслухмяную скацінку" — пчол, лічылі асаблівымі людзьмі, "знаўцамі", і сярод аднавяскоўцаў да іх былі з аднаго боку паважлівыя, а з другога — насцярожаныя адносіны.

Калі побач з пчальнікам былі крыніца, ручай або калодзеж, то вада ў іх лічылася гаючай, ратуючай ад многіх хвароб: "Там, дзе жыве Боская ўгодніца, усё святое". Над такой крыніцай абавязкова ставілі капліцу з іконай Салавецкіх святых Зосімы і Савація і чыталі малітвы ў святочныя дні.

Усе славяне, ад старога да малога, ведалі пра даволі жорсткую забарону шкодзіць пчолам. Забіць пчалу без нагоды лічылася вялікім грахом, скрасці вулей ці калоду — страшэнным злом, а разбурыць вулей — "разбурыць храм Божы". Старыя людзі гаварылі так: "Калі злодзей, выдраўшы мёд з борці, загубіць рой, гэта злачынства параўноўвалі з забойствам чалавека, і чакаць трэба самага жорсткага пакарання".

Паўсюдна лічылася, што гаспадар павінен размаўляць з пчоламі як з разумнымі істотамі, нібы яны з'яўляюцца членамі яго сям'і. Ім трэба расказваць пра сямейныя навіны, раіцца з імі. Лічылася, што ў такім выпадку пчолы вельмі хутка прывыкнуць да гаспадара і будуць цярпліва вытрымліваць усе яго дзеянні ў дачыненні да вулля, рою і т.п.

У традыцыйнай культуры славян існавала цэлая сістэма прадказанняў смерці і дрэнных спраў. Напрыклад, калі ў садзе высыхала яблыня, чакалі, што хутка памрэ гаспадар — заснавальнік сядзібы, той, хто заладжыў сад. Калі з печы выпадала цагліна, хутка сыдзе ў "той" свет гаспадыня. А калі рой вылецеў і сеў на сухую галіну зялёнага дрэва, гэта лічылася прадказаннем смерці пчаляра, "гаспадара" пчол. Яшчэ казалі, што пчолы не "ганаруюць" таго гаспадара, які любіць есці мёд, "і блага ў яго вядуцца".

Прыляцеўшы ў сад чужы рой лічыўся добрай прыкметай, знакам дабрабыту і прыбытку ў хаце і гаспадарцы. Гэты рой трэба было асабліва ахоўваць.

Па паводзінах пчол прыкмячалі будучае надвор'е: калі пчолы хутка ляцяць да вулляў — будзе дождж; становяцца злымі, часцей джаляць — будзе засуха; сядзяць на сценах вулля — да спякоты.

У народнай медыцыне мёд выкарыстоўвалі пры лячэнні захворванняў страўніка, печані, гнойных ран, ангіны, падчас атручвання, як сродак, які паніжае высокую тэмпературу, і як цудадзейныя лекі ад цяжкага кашлю.


У адным старажытным медыцынскім трактаце было напісана так: "Мёд аздараўляе ўсе ўнутраныя органы, падтрымлівае моц арганізма, памяншае гарачку. Доўгатэрміновае яго ўжыванне ўзмацняе волю, надае лёгкасць целу, захоўвае маладосць, падаўжае гады жыцця". Немагчыма з гэтым не пагадзіцца.

Аксана КАТОВІЧ





“Родные просторы”.



“Привидения Минского моря”.

САМОЕ ВЕЛИКОЕ ЧУДО

Человеку повезло, если он родился и вырос в деревне, на природе; художнику — особенно

Так говорит художник Анатолий Белявский, в небольшой уютной мастерской которого на самом видном месте — фотография его любимых дедушки и бабушки, маминых родителей. К ним, на Мядельщину, отвозили мальчика из деревни Вишнево Сморгонского района каждое лето. Дед учил слушать лес, узнавать травы... Через много лет именно дедова наука поможет выпускнику Белорусского театрально-художественного института Анатолию Белявскому написать дипломную работу — серию картин “Лечебные травы”.



“Тишина”.

Деда и бабушку Мелешек на Мядельщине хорошо знали: в трудное послевоенное время они ходили по селам со швейной машинкой и шили людям очень даже неплохую и модную по тем временам одежду. Мама художника чудесно вязала и вышивала, а отец, учитель рисования, писал стихи и иллюстрировал их собственными акварелями. Он и ребятишек учил создавать самодельные книжки с картинками. Среди его учеников был и известный ныне белорусский художник Василий Шарангович. Так что мальчик Толя уже с пяти лет точно знал, что будет художником.

Белявского, работы которого сейчас украшают престижные коллекции мира, называют художником со своей интонацией. И внимательный зритель действительно отметит эту интонацию, особенно в пейзаже. Это — лиричность, граничащая с пасторальностью. Осторожно говорю об этом художнику, а он охотно соглашается: да, воспринимаю мир оптимистично и радостно, вижу солнце даже сквозь серые тучи. Потому и появляется в его пейзажах неожиданный розовый цвет.

А еще в них много воды. И дело не только в воспоминаниях о детстве на мядельских озерах. Вода дает неограниченные возможности в художественном письме, чудесно преломляет свет... Она, в конце концов, — символ жизни. Деревья тоже герои полотен Белявского. Ведь они — как люди, убежден художник, и у каждого — свое лицо. И на этих “лицах” — информация о множестве событий за десятилетия и даже столетия. И счастье, если с помощью красок и кисти удается ее прочесть.

Белявский — художник, работающий в разных жанрах. Портрет, натюрморт, полотна на исторические и религиозные темы... Но все больше и больше времени отдает он пейзажу. При этом не спорит с природой, не диктует ей свои законы, а принимает ее правила, передавая на полотне лишь свои ощущения. Земля для него — живое, меняющееся и в то же время вечное существо. А жизнь на ней — самое великое чудо.

Лидия ПЕРЕСЫПКИНА



“Раков”.

Зіхоткія пацеркі лета

Якое яно ўсё ж такі зменлівае і хуткаплыннае — наша беларускае лета. Спачатку абнадзеіць нечаканым цяплом, здзівіць буйнатраўем, раскошай колераў і гукаў. А пасля гэтак жа раптоўна зададжджыць, заплача, пазычыўшы ў восені слёз, і, не паспеўшы як след абагрэць сваёй ласкай зямлю, разам з птушкамі адляціць у вырай…

Лета — нібы бесклапотнае юнацтва: такое ж кароткае, але і такое ж дарагое сэрцу. А яго імгненні — гэта зіхоткія пацеркі, якія нанізваеш адна на адну, каб потым перабіраць у памяці нуднай зімой.


Фота Анатоля ДРЫБАСА

Чэрвеньскае дзіва

Сярэдзіна чэрвеня, вечар. З 8-гадовым пляменнікам крочым па вясковай дарозе ўслед за сонцам. Яшчэ не хутка час, калі яно схаваецца за гарызонтам, але той спёкі, што панавала днём, ужо няма. І таму хочацца проста ісці, не абцяжарваючы галаву думкамі, цешыцца навакольным хараством.

Уздоўж дарогі цвіце лубін (асабіста для мяне ён — самая выразная прыкмета першага летняга месяца), травяным водарам патыхае ад блізкага поля, павольна плывуць па небе лагодныя аблокі… І вось яно — маленькае чэрвеньскае дзіва: у зарасніках прыдарожнага хмызняку знаходзім прыгожы, крамяны падасінавік. Не ўцерпеў да восені, пасля нядаўніх дажджоў і цяпла заспяшаўся паказаць сябе свету. Па праўдзе кажучы, я не адношуся да ліку заўзятых грыбнікоў, але ў той момант, трымаючы ў руках аранжавы мацачок, іхні імпэт адчула адразу.

Пасля, у іншыя дні, яшчэ два разы падасінавікі самі "выбягалі" насустрач. І, як і ў той чэрвеньскі вечар, зноў уражвалі сваім адмысловым аблічам і дасканаласцю.


Фота Васіля ЗЯНЬКО

Ліпеньская "водаратэрапія"

У той год ліпы пачалі цвісці яшчэ ў чэрвені. Іхнім густым, насычаным водарам было напоўнена паветра побач з будынкам нашай рэдакцыі, вакол якога растуць гэтыя велічныя дрэвы. У ліпавай квецені патанала і вясковая вуліца, што вечарам вітала мяне пасля працы. У такія дні не раз сустракала аднавяскоўцаў з пахучымі галінкамі ў руках: насушыць на зіму ліпавага цвету — неабходны летні клопат, як і шчыраванне на агародзе.

Гэты духмяны рай на зямлі панаваў ці не са два тыдні, і было адчуванне, што навокал не існуе іншых пахаў…

Хаця, як мне здаецца, усе водары прыроды — такія ж дасканалыя, непаўторныя, як і яе формы, фарбы, гукі. А летняя "водаратэрапія" — самы дзейсны і эфектыўны сродак, каб вярнуць душы гармонію і спакой.

Жнівеньскія абліччы

І вось, нарэшце, жнівень — сталасць, мудрасць лета. Паважнаму, няспешнаму, яму не ўласціва легкадумнасць чэрвеня альбо гарэзлівасць ліпеня. Бо ён — не "зялёны" юнак, што спяшаецца зведаць смак спакусаў жыцця. Жнівень — гэта гаспадар, які дбае пра хлеб чарговага ўраджаю, пра зімовыя нарыхтоўкі, пра птушынае папаўненне, што ўслед за сваімі клапатлівымі бацькамі ўпэўнена і імкліва становіцца на крыло…

Прадвеснік восені, апошні месяц лета спакваля рыхтуе нас да яе блізкага надыходу. Жоўтыя пасмачкі ў зялёных косах бяроз і першае апалае лісце; золкія ранкі і густыя туманы; водар спелай гародніны і задуменнае (такім яно бывае толькі ў гэту пару) начное неба…

А яшчэ адно з яскравых жнівеньскіх абліччаў — гронкі рабіны, што раптам "загараюцца" на фоне зялёных дрэў. Пакуль толькі аранжавыя, рабінавыя "каралі" з дня ў дзень спеюць, наліваюцца чырванню. А руплівец жнівень крочыць сабе далей па нашай зямлі, адорваючы яе асаблівай замілаванасцю і хараством, уласцівымі толькі для гэтага, сапраўды дзівоснага часу года.

Ірына МАТУСЕВІЧ

В красках о Беларуси

рассказывают участники международного пленэра “R+Я”, который ежегодно проходит в Дзержинском районе Минской области, объединяя слышащих, глухих и слабослышащих художников из разных стран

История этой творческой традиции насчитывает около пятнадцати лет. И все шире становится круг друзей у проекта, каждый раз по-новому воспевающего красоту белорусского лета.



Участники пленэра подарили Алле Вергейчик свои картины и теперь гости усадьбы могут любоваться картинной галереей в усадьбе “Наквасы”.

Как правило, пленэр “R+Я” проводится на базе Дома народного творчества в деревне Великое Село и включает в себя ежедневные путешествия за вдохновением. Ляховичи, Волма, Новосады, Боровое, Пионино, Ласицковщина, Рубежевичи, Сула — не счесть всех живописных уголков Минщины, куда выезжают работать участники пленэра! В Дзержинском районе агроусадьба “Наквасы” и ее окрестности особенно привлекли живописцев. Они оценили ландшафтный дизайн на территории усадьбы, тонко и гармонично вписанный в естественную природу. В этом году хозяйка Алла Вергейчик пригласила художников расположиться в “Наквасах”, и полторы недели пленэра пролетели, заполненные вдохновенным творчеством.

— Наш пленэр взаимно обогащает глухих и слышащих, дает возможность профессионального роста молодым художникам, расширяет границы общения, — рассказывает Наталия Ермолович, заведующая Великосельским Домом народного творчества и куратор проекта в Беларуси. — Мы ежегодно собираемся с 2003 года,





от 10 до 20 человек. Не только плодотворная работа, но и тепло отношений, и незабываемое общение, необыкновенно творческая атмосфера этих встреч делают их духовной необходимостью для многих.

“R+Я”-2017 снова объединил мастеров кисти в любви к белорусским пейзажам.

Из Гомеля приехал Василий Сидоренко — неизменный участник пленэра и один из его основателей. Талантливый художник и педагог, он вкладывает душу в обучение живописи детей с нарушениями слуха. Уже три его

__Пленэр__ (от фр. en plein air — “на открытом воздухе”) — живописная техника изображения объектов при естественном свете и в естественных условиях.

Наталия Ермолович: ***“Пленэр называется “R+Я” не случайно. Две буквы “Я” словно поворачиваются друг к другу и протягивают руки дружбы, уважения, помощи, сострадания, любви. А знак “+” символизирует наше стремление к тому, чтобы в мире, где так много вычитания, был устойчивый островок сложения”.***



ученика стали студентами художественной академии в Минске. Стоит лишь немного понаблюдать за ним в работе, и его горящие творческим азартом глаза разбудят в вас желание рисовать, даже если “каляка-маляка” в рабочем блокноте до сих пор была вашим лучшим произведением!

Из Симферополя приехал на Минщину Вячеслав Гусев. Он преодолел все сложности путешествия ради новой встречи с единомышленниками. Признанный маринист, он очарован белорусской природой, профессиональным чутьем улавливает неповторимые мгновения, запечатлевая их в своих работах.

Всегда активно поддерживает и продвигает проект талантливый живописец из Москвы Анатолий Микляев, президент Ассоциации глухих художников России. В каждый приезд он собирает большую коллекцию фотографий, набросков, этюдов, чтобы продлить ощущение вдохновения, рожденное на белорусской земле.

Художник и архитектор из Киева Алексей Нашивочников также не впервые участвует в пленэре “R+Я”. Несмотря на глухоту, он получил блестящее образование и добился значительных успехов в профессии: по его проектам в украинской столице построены 8 станций метро. В живописи он нашел свой особый стиль, отражающий его яркий и чувственный внутренний мир.

Из Санкт-Петербурга приехал на пленэр Сергей Вишняков. Красота природы в его работах передана с детальной точностью, вплоть до тончайшей сеточки на крыльях стрекозы, “пойманной” художником в разноцветьи лугов.

Глухие художники легко подружились со слышащими белорусскими коллегами, которых на пленэре в этом году представляли молодые живописцы Лера Лазук и Дмитрий Петровский из Минска под руководством известного белорусского художника Алеся Пушкина. В работах Леры неизменно драматическую роль играет цвет, а общий замысел раскрывается через детали. Характеризуя манеру письма Дмитрия, коллеги называют его наследником традиций старой белорусской школы живописи.

Традиционно каждый пленэр “R+Я” завершается вернисажем, где экспонируются как новые этюды, наброски, так и работы, привезенные художниками с собой. Нередко это картины, начатые или задуманные на пленэре в прошлом году. Выставка в “Наквасах” стала праздничным событием. Посетители подолгу рассматривали работы, узнавая родные места и сюжеты, получая возможность взглянуть на них совершенно по-новому.

Экспозицию участников пленэра дополнили и этюды учащихся Дзержинской школы искусств, написанные в этот день на территории усадьбы. Творческое знакомство профессиональных и начинающих художников оставило яркие впечатления.

Ветеран фермерского движения Беларуси Константин Ермоленко отметил, что инициатива владельцев усадьбы “Наквасы”, поддержавших проект, может стать прекрасным примером и образцом для подражания. А владелец хозяйства Василий Вергейчик пригласил участников пленэра в усадьбу и на будущий год, пообещав, что поможет художникам еще и в организации поездки на Витебщину. А это значит, уникальный живописный рассказ участников международного пленэра глухих и слышащих художников “R+Я” о красоте Беларуси продолжается.

В круговерти будней, срочных и очень важных дел остановитесь хотя бы на минуту и посмотрите вокруг. Позвольте себе увидеть красоту этих мгновений и впустите ее в свою душу. Возможно, в этом один из секретов художников, умеющих по-новому рассказать нам о, казалось бы, хорошо знакомом и привычном.

Наталия ТРАЦЕВСКАЯ
Фото автора





Лунёвае лета

Падарожжа з арнітолагам

— Рыбгас "Волма" з'яўляецца важным прыродным рэзерватам, тэрыторыяй для захавання многіх папуляцый птушак, — кажа біёлаг, дырэктар рэспубліканскай грамадскай арганізацыі "Ахова птушак Бацькаўшчыны" Аляксандр Вінчэўскі. — Для беларускіх арнітолагаў гэта сапраўдны рай, бо ў вяснова-летні перыяд колькасць птушак тут дасягае амаль двухсот відаў.

Ад сталіцы да рыбгаса крыху больш за 50 кіламетраў. Гадзіна язды — і я ў кампаніі вядомага навукоўца на беразе адной з сажалак гаспадаркі. Мы ідзем па дамбе ўздоўж канала, узгадваем акцыі, якія ладзіла "АПБ", новыя прыродаахоўныя праекты. Вядома, гаворым і пра птушак. Аляксандр вядзе мяне да гнёздаў балотнага луня — у біёлага там будзе даследчая праца. Дзякуючы Аляксандру Вінчэўскаму, мне пашанцавала ўпершыню не толькі ўбачыць, але і паздымаць і хатку драпежніка, і яго птушанят, і самога арнітолага за працай у водна-балотных умовах. Загадзя скажу: гэта экспедыцыя прынесла мне сапраўднае задавальненне!

Нарэшце мы спыняемся, адкатваем халявы ботаў-балотнікаў і збочваем з дамбы ў высокі густы чарот. Вада вышэй за калена. Арнітолаг паперадзе, як павадыр, я ледзь паспяваю за ім, баюся, каб не спатыкнуцца і не патапіць фотаапаратуру. Леташні чарот з трэскам ломіцца, неахвотна саступаючы нам дарогу. Нарэшце перад намі невялічкая, метр на метр, прастора. На ёй і пабудаваў лунь сваё гняздо — платформу з трыснягу і сухіх галін, падобную да вялікай патэльні.









Пачуўшы наша хлюпанне і трэск, самка адляцела, а птушаняты (іх было пяць) прынялі ваяўнічую позу, гатовыя бараніцца ад няпрошаных гасцей. Аляксандр паставіў на гняздо невялікія электронныя вагі, дастаў лінейку, зялёны фламастар і пачаў узважваць гадаванцаў з лунёвага "дзіцячага саду", абмяраць крылы, дзюбы, рабіць пазнакі пад крылом аднаго з іх — самага дарослага з выводку. Нешта заносіў і ў свой невялікі блакноцік.



Напэўна, ужо не адзін такі блакнот спісаў арнітолаг у экспедыцыях па рыбгасе. Шмат гадоў запар Аляксандр Вінчэўскі даследуе балотнага луня на гэтай тэрыторыі. Калісьці прыязджаў сюды з Гродна, калі працаваў у тамтэйшым універсітэце. А наконт выбранага для маніторынгу птушынага віду арнітолаг кажа: “Гэты від хоць і распаўсюджаны, але яшчэ мала вывучаны. Свае гнёзды лунь будуе на вадзе, схаваўшы ад дапытлівых вачэй. Таму гэтая птушка для многіх скрытая, загадкавая”. Многія арнітолагі ганяюцца за рэдкімі відамі, а Аляксандр Вінчэўскі выбраў гэты, непапулярны, і з году ў год вядзе дасканалы маніторынг. Таму, як ніхто іншы, ён ведае амаль усё пра валмянскага луня.

На пяць хвілін затрымліваемся каля гнязда — за гэты час работа арнітолага павінна быць завершана. Стараемся не пакідаць ніякіх сведчанняў сваёй прысутнасці, па той жа дарозе выбіраемся на бальшак. Ідзём шукаць сцяжыну да іншага гнязда.

— Калі раскрыць гняздо, больш буйныя драпежнікі, такія як арланы, могуць забіць птушанят, — тлумачыць навуковец.

З сярэдзіны сакавіка, калі першыя луні прылятаюць з выраю, Аляксандр назірае за паводзінамі птушак. І стараецца не нанесці ім шкоды. З першага выхаду арнітолага на лунёвую прастору ў яго блакноце з’яўляюцца новыя лічбы і цікавыя факты, важныя для навукі. У яго жалезнае правіла — кожны тыдзень абавязкова наведвацца на гэтыя трысняговыя берагі. На адной з рыбгасаўскіх сажалак жывуць пяць пар балотных лунёў, яшчэ тры гнязды — на дзвюх іншых. Гнёзды знойдзены на трох сажалках з дзевяці абследаваных.

Вядома, што ў балотнага луня, як і ў іншых драпежных, наседжванне яек самкай працягваецца амаль месяц. У пачатку чэрвеня ў лунёў з’яўляюцца першыя птушаняты. А ў Аляксандра Вінчэўскага ў гэты момант пачынаецца самы адказны і плённы перыяд даследнай працы. Можна сказаць, на вачах арнітолага маленькія луні ператвараюцца ў дарослых, самастойных птушак. Як сіноптыкі і гідролагі, што фіксуюць усе паказчыкі надвор’я, гэтак і арнітолаг прыходзіць у вызначанае месца і ў вызначаны час робіць неабходныя замеры, якія стануць каштоўным матэрыялам для сусветнай навукі.

Важны перыяд у жыцці птушкі — выкормліванне моладзі. У лунёў ён працягваецца не менш за месяц. Але рэдка які вывадак застаецца без страт — з пяці-сямі птушанят дарослага ўзросту дасягаюць толькі тры-чатыры. Арнітолагу важна зразумець, чаму так адбываецца, паназіраць, чым сілкуецца лунь, што складае яго рацыён. Сёлета надвор’е добрае, і ў ваколіцах рыбгаса ежы птушкам дастаткова. Птушаняты за тыдзень прыбаўляюць у вазе па 100-120 грамаў.

Каля наступнага гнязда мяне чакаў бонус. Скончыўшы замеры і запісы, арнітолаг павёў да невялікай калоніі літаральна за пару метраў ад лунёвага сховішча. На хісткіх трысняговых заломах сядзела трое маленькіх птушанят вялікай белай чаплі — калісьці рэдкага віду ў нашай краіне.

У адной з такіх экспедыцый Аляксандр абавязкова правядзе кальцаванне птушанят і луня, і белай чаплі. Бо гэтыя птахі — не аселыя птушкі, на зіму яны адлятаюць: лунь — у далёкую Афрыку, чапля — у Заходнюю Еўропу. Таму ў кожнага птаха павінен быць свой нумар, накшталт пашпарта. Але гэта будзе пазней: птушанятам трэба яшчэ падрасці і падужэць.

Анатоль КЛЯШЧУК,
Чэрвеньскі раён
Фота аўтара





В апитерапии сегодня широко используются не только продукты пчеловодства, но и сами полосатые труженицы. По мнению специалистов, укусы и завораживающее жужжание пчел приносят человеку оздоровление как на физическом, так и на духовном уровне.

Фото Анатолия КЛЕЩУКА

Лечимся... пчелами

Яд, который исцеляет

В основе апитерапии лежит апитоксин — пчелиный яд. В свежем виде он представляет собой прозрачную, слегка желтоватую жидкость с резким запахом. Химический состав этого вещества был изучен сравнительно недавно и пока не полностью. В него входят 18 аминокислот, 10 микроэлементов, а также муравьиная, ортофосфорная, соляная кислоты — это они вызывают ощущение жжения при ужалении пчелы.

